# Радаснае свята «Светлы Вялікдзень!»

Перад Вялікаднем у аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» асабліва ажыўлена - выхаванцы з стараннасцю і любоўю вырабляюць велікодныя сувеніры.

У аддзяленні прайшлі сустрэчы з прадстаўнікамі каталіцкай і праваслаўнай канфесій. Усе разам вучыліся фарбаваць яйкі натуральнымі фарбавальнікамі. Рукамі атрымальнікаў сацыяльных паслуг аддзялення былі падрыхтаваныя велікодныя кампазіцыі і паштоўкі «Са Святам!», упрыгожаныя вярбы. Кожны выраб - сапраўдны цуд. Вынікам працы стала выстава «Светлы Вялікдзень».









